# РЭГІЁН

№ 8
11 сьнежня 2008 г.
Інфармацыйнае выданне
Распаўсюджваецца бясплатна


# «Дорожная карта» Милинкевича

**Александр Томкович: После того, как вы поддержали частичную отмену санкций в отношении белорусских чиновников, некоторые поспешили назвать вас едва ли не предателем, подчеркивая, что будет очередное «кидалово». В чем суть вашей «дорожной карты»?**

Александр Милинкевич: Я тоже не питаю больших иллюзий. За один день власть не может превратиться из авторитарной в демократическую, но рассуждаю, как прагматик. Лукашенко сейчас не хочет объединяться, хотя при Ельцине, наверняка идея возглавить общее государство была. Благодаря интеграционной риторике Беларусь много лет получала дотации в виде дешевых энергоносителей. Они продолжились и при новой кремлевской команде, но желание реального объединения уже исчезло. Россия долго верила обещаниям, но потом осознала, что ничего в политическом плане не произойдет. И тогда она сменила тактику. Сказала, что раз нет объединения, то не будет и льгот.

**А.Т.: «Мухи» – отдельно, «котлеты» – отдельно…**

А.М.: Совершенно верно. Было предложено в межгосударственных расчетах за 2-3 года перейти на мировые цены. И здесь логика России понятна, ибо подарки делаются только, если есть какая-то перспектива – «Союзное государство», введение российского рубля, приватизация белорусских предприятий.

Беларусь оказалась неготовой к переходу на рыночные отношения с Россией. Мы не воспользовались тем, что имели уникальные возможности для того, чтобы модернизировать собственную экономику, сделать ее более современной, провести сложные реформы. Они тоже стоят немалых денег.



*Александр Милинкевич*

В настоящий момент наша страна имеет промышленность и сельское хозяйство с очень невысоким уровнем технологий, и на белорусских предприятиях в основном устаревшее оборудование. То, что мы сегодня производим, все тяжелее продавать в другие страны. Даже в Россию. К новым ценам на энергоносители мы совершенно не готовы, а раз так, то нам где-то приходится искать деньги для оплаты своих потребностей. И их, опять же, мы берем в России. А это ведет к финансовой кабале. На начало этого года по данным Национального банка совокупный внешний долг был около 11 миллиардов долларов. И почти весь России. Сейчас прибавьте еще 2 миллиарда. Экономисты утверждают, что 15-20 миллиардов долга практически означают окончательную зависимость. Возможно, политического объединения не будет, и нам удастся сохранить атрибуты независимого государства. Но экономически мы будем в полном подчинении. Расплачиваться придется фабриками, заводами, землей и т.д. Раз есть опасность потери экономической независимости, надо думать, что можно сейчас сделать. Никто нам просто для того, чтобы была возможность рассчитаться с Россией, денег не даст. Надо зарабатывать самим. Для того, чтобы появилась такая возможность, в экономике нужны срочные модернизация и либерализация. А если начинаешь реформы, всегда нужны стабилизационные деньги. Кроме этого нужно также привлечь солидные инвестиции.

**Начало. Продолжение на стр. 4-5**

# Разагналі

**Прадстаўнікі дэмакратычнага руху Беларусі адзначылі Ўсясьветны дзень правоў чалавека вулічнымі акцыямі і імпрэзамі. У Менску міліцыянты затрымалі больш за дзясятак чалавек. Усіх адвезьлі ў міліцыю Цэнтральнага раёну Менску. Затрыманыя сьцьвярджаюць, што некалькі чалавек зьбілі ў міліцыі.**



*Людзі ў штацкім заламваюць рукі старшыні міжнароднай федэрацыі правоў чалавека Алесю Бяляцкаму*

Спачатку ў міліцыю Цэнтральнага раёну Менску трапілі восем актывістаў руху “Маладая Беларусь” — яго лідэр Артур Фінькевіч, Алесь Круткін, Алесь Сьцепаненка, Сяржук Клюеў, Валер Саковіч, Раман Багдановіч, Ніка Лазоўская і Вольга Бурневіч.

Яны сабраліся а 14 гадзіне каля будынку Міністэрства ўнутраных спраў. Маладыя людзі надзелі на сябе паласатыя робы. На грудзях у іх былі шыльды з надпісамі: “Я незалежны журналіст”, “Я сябра незарэгістраванай арганізацыі”, “Я невыязны”, “Я праваабаронца”, “Я былы студэнт”, “Я незалежны назіральнік”, “Я былы прадпрымальнік” ды іншыя.

Літаральна праз пару хвілінаў каля будынку зьявіўся міністар унутраных спраў Уладзімер Навумаў у каўбойскім капелюшы. Ён нечакана сутыкнуўся з удзельнікамі акцыі і адразу патэлефанаваў сваім падначаленым. Каля будынку КДБ удзельнікаў акцыі дагналі спэцназаўцы. Яны спачатку выціснулі актывістаў на вуліцу Камсамольскую, а потым завялі ў двор КДБ.

Затрыманых адвезьлі ў міліцыю. Артур Фінькевіч апавёў, што там зь імі абыходзіліся вельмі груба. Некалькі чалавек зьбілі, у тым ліку й Артура.

“У райаддзеле абыходзіліся па-хамску, жорстка. Патрабуючы стаць ледзь не на шпагат. Я вымушаны быў абараніць свайго паплечніка. Пасьля гэтага мяне вывелі ў калідор, адтуль у нейкі пакой. Там ударылі некалькі разоў па розных частках цела, у тым ліку па сьпіне і галаве”.

Праз гадзіну спэцназаўцы затрымалі кіраўніка праваабарончага цэнтру “Вясна” Алеся Бяляцкага, кіраўніка моладзі БНФ Франака Вячорку, Антона Койпіша, Сержука Семянюка, Сержука Карповіча, Сяргея Сыса і некалькі дзяўчат.

Удзельнікі акцыі апранулі белыя камізэлькі, на якіх блакітнымі літарамі было напісана: “Дэклярацыі правоў чалавека 60 гадоў”. Яны зьбіраліся раздаваць мінакам брашуры з тэкстам Дэклярацыі.

У ГУМе маладыя людзі ўбачылі, што за імі ідуць спэцназаўцы ў цывільным.

“Мы вырашылі замесьці сьлед і схаваліся ў аддзеле жаночай бялізны на чацьвёртым паверсе, умоўна кажучы, каб пасьмяяцца са спэцназаўцаў. Мы сказалі прадаўшчыцам, што за намі сочаць п’яныя мужчыны. Тады яны выклікалі ахову. Спэцназаўцы вымушаныя былі сысьці

Калі мы спусьціліся ўніз, спэцназаўцы наладзілі паўнавартаснае прадстаўленьне. Наведнікі ГУМу ўбачылі, як зрываюць з моладзі накідкі, як рвуць Дэклярацыі правоў чалавека, як нас нясуць у аўтобус. Я думаю, што гэта будзе добрым урокам для эўрапейскай грамадзкасьці наконт таго, што ёсьць дэмакратыяй у Беларусі” – зазначыў для Радыё Свабода Франак Вячорка.

Гэта была трэцяя па ліку акцыя цягам дня. Першая адбылася аб 11-й гадзіне. На Кастрычніцкай плошчы сабраліся лідэр АГП Анатоль Лябедзька, лідэр незарэгістраванай арганізацыі “Малады фронт” Зьміцер Дашкевіч, актывіст АГП Міхаіл Пашкевіч, актывіст незарэгістраванай арганізацыі “Бунт” Антон Койпіш, лідэр моладзі БНФ Франак Вячорка.

Яны прайшлі з таблічкамі на грудзях “Палітневыязны” ў суправаджэньні журналістаў у прыёмную адміністрацыі Аляксандра Лукашэнкі.

Там яны падалі заяву на імя кіраўніка дзяржавы з патрабаваньнем выкрасьліць іхныя прозьвішчы з “чорнага сьпісу”.

Анатоль Лябедзька заявіў, што, калі пытаньне ня будзе вырашана станоўча, “невыязныя” будуць ладзіць акцыі пратэсту.

Такім чынам, у выніку вулічных акцый, прысьвечаных Дню правоў чалавека, толькі ў Менску было затрымана больш за дзясятак іх удзельнікаў. Некалькі чалавек зьбілі падчас затрыманьня і ў міліцыі. Усіх затрыманых адпусьцілі.

**Радыё Свабода**

# Сустрэчу Мілінкевіча ў Гродна не дазволілі

**Гарадзенскія ўлады забаранілі правядзенне сустрэчы лідэра незарэгістраванага руха “За свабоду” Аляксандра Мілінкевіча з жыхарамі горада 13 снежня бягучага года. Афіцыйная падстава – адсутнасьць вольнага мейсца ў палацы культуры тэкстыльшчыкаў, дзе павінна было адбыцца мерапрыемства.**

Жыхары Гародні ў свой час не аднойчы звярталіся з прапановай да былога дэпутата гарсавета Сяргея Кузьмянка і іншых грамадскіх актывістаў з прапановай зарганізаваць сустрэчу з Аляксандрам Мілінкевічам . Вынікі парламенцкіх выбараў, грамадска-палітычнае жыццё краіны і сацыяльная неабароненасьць насельніцтва-вось далёка не поўны спіс пытанняў, якія хвалюющь жыхароў горада. Аднак намеснік старшыні гарвыканкама Ірына Сенчанкова пісьмова паведаміла арганізатарам сустрэчы аб немагчымасці яе правядзення ў сувязі з тым, што заяўленае памяшканне ў акрэслены час будзе занята планавымі мерапрыемствамі.

Па словах Аляксандра Мілінкевіча, захады мясцовых уладаў ніякім чынам не перашкодзяць правядзенню яго сустрэчы з гарадзенцамі.

Як сведчыць практыка, такая форма адмовы – для гарадзенскіх уладаў з’яўляецца традыцыйнай. Папярэднія спробы правесці афіцыйныя сустрэчы гарадзенцаў з былым кандыдатам у прэзыдэнты мясцовыя ўлады таксама блакавалі, але мерапрыемствы праходзілі на вуліцы ў выглядзе несанкцыянаваных мітынгаў.

**Радыё Рацыя**

## У Астраўцы рыхтуюць мітынг пратэсту

**Праціўнікі будаўніцтва АЭС падалі заяўку на мітынг на 27 снежня пад лозунгам “Астравецкая атамная – гэта злачынства!”**

Прыхільнікі Руху “За Свабоду”, сябры аргкамітэту супраць будаўніцтва АЭС у Астравецкім раёне Мікола Ўласевіч і Іван Крук не падзяляюць пляны будаўніцтва АЭС на тэрыторыі Нарачанска-Вілейскага запаведнага краю, паколькі лічаць, што гэта месца можа ператварыцца ў яшчэ адну “чарнобыльскую дзірку” на мапе Эўропы.

Некалькі тыдняў таму яны прынялі заяву да ўсіх грамадзянаў Беларусі, органаў улады, да Эўрапейскай супольнасьці, МАГАТЭ й СМІ ад Аргкамітэту грамадзянскай ініцыятывы “Астравецкая атамная — гэта злачынства!”

У лістападзе сябры аргкамітэту грамадзянскай ініцыятывы падавалі таксама заяву ў райвыканкам на правядзеньне пікетаў супраць будаўніцтва АЭС у Астравецкім раёне. У гэтым ім было адмоўлена.

**Радыё Свабода**

# Малых предприятий стало больше на 36%

**Количество малых предприятий в январе-сентябре 2008 года увеличилось на 36,3% по сравнению с данными на 1 октября 2007 года, сообщили БелаПАН в пресс-службе Министерства экономики Беларуси.**

На 1 октября нынешнего года в республике функционировало 50,3 тыс. малых предприятий (на 1.10.2007 — 39,6 тыс.).

Списочная численность работающих на малых предприятиях в январе—сентябре этого года составила 458,7 тыс. человек (за девять месяцев 2007 года — 416,3 тыс.). По численности работающих лидировали промышленные предприятия — 38,7% от общего количества занятых на малых предприятиях, на предприятиях торговли и общественного питания было занято 25,1%, в строительстве — 15,7%, на транспорте — 8,2%.

Удельный вес валового внутреннего продукта, произведенного субъектами малого предпринимательства, составил 8,9% от общего объема ВВП и вырос по сравнению с аналогичным периодом прошлого года на 1,3%. За девять месяцев субъектами малого предпринимательства произведено 8,2% от общего объема промышленного производства (за девять месяцев 2007 года — 7,7%); 14,7% от общего объема розничного товарооборота (11%); 16,2% от общего объема внешнеторгового оборота (15,2%). Удельный вес выручки, полученной за январь—сентябрь 2008 года малыми предприятиями, составил 18% и вырос по сравнению с аналогичным периодом 2007 года на 1,4%.

Рентабельность реализованной малыми предприятиями продукции (работ, услуг) составила 19,5% (за аналогичный период 2007 года — 14,6%).

По информации Минэкономики, количество индивидуальных предпринимателей на 1 октября 2008 года в Беларуси составило 216,2 тыс. человек, что на 6,1% больше, чем за аналогичный период 2007 года.

**БелаПАН**

## Литовский контрабандист оборудовал топливный бак под сигареты

**8 декабря в пункте упрощенного пропуска “Поречье” на белорусско-литовской границе была предотвращена попытка контрабандного вывоза из страны партии сигарет.**

Как сообщил БелаПАН начальник пресс-центра Государственного пограничного комитета Александр Тищенко, 500 пачек сигарет российского производства пограничники обнаружили в тайнике, оборудованном в автомобиле “Ауди”, которым управлял гражданин Литвы. Бак машины был разделен на две части, при этом часть, оставшаяся для топлива, могла вместить всего 5—7 литров.

Контрабандный товар конфискован. Будет ли у нарушителя изъята машина, оценка которой сейчас производится, решит суд.

Как отметил А.Тищенко, подобного рода контрабандисты рассчитывают исключительно на случай. По его словам, каждый специалист пограничного контроля достаточно осведомлен о конструктивных особенностях автомобилей, и для него обнаружить тайник не представляет особого труда.

**БелаПАН**

# «Дорожная карта» Милинкевича

**Окончание. Начало на стр. 1**

Кроме Евросоюза других партнеров нет. Россия ни в политических, ни в экономических реформах не заинтересована, потому что, если их не будет, мы быстрее «упадем». В России совершенно очевидная тенденция, если не к полному восстановлению СССР, то хотя бы к возрождению максимального влияния на пространстве бывших советских республик. Дипломатического, политического, экономического.

Евросоюз выдвинул 12 условий. Если б мы их выполнили, сотрудничество было бы давным-давно. Но власть боится их выполнить, потому что для нее это политическая смерть. Новая идея ЕС состояла в том, что поскольку суверенитет Беларуси, действительно, под угрозой, а для Европы стабильность, предсказуемость, неизменность границ очень важны, выбрать несколько первых условий. Это не значит отказ от всех остальных. Предложена «пошаговая» стратегия. Вы нуждаетесь в поддержке экономических реформ? Мы готовы помочь, но начинайте что-то делать. В этом году были освобождены из тюрем все 8 политзаключенных. Правда, тут же появился новый – Александр Борозенко. Второй экзамен – парламентские выборы – власть провалила, они не признаны демократическими. Европа, отменив часть визовых ограничений для представителей режима, пошла навстречу в ответ на первый шаг.

И я просто не вижу альтернативы. Других вариантов попросту нет. Что, вновь «берлинская» стена, продолжение самоизоляции Беларуси и падение в Россию?.. Поэтому диалог – это абсолютная необходимость.

Для сравнения можно смоделировать такую ситуацию. Вся Беларусь сидит в самолете, за штурвалом Александр Лукашенко. Нам всем не нравится, как он ведет самолет. Можно ему завязать глаза, можно надеть наручники, а кто-то совсем отчаянный может взорвать в салоне гранату. И не станет режима. А что с Беларусью?

Я противник принципа «чем хуже, тем лучше». Некоторые считают, что нужны санкции, изоляция, что власть



*Александр Милинкевич*

следуют «додушить», режим упадет быстрее, и наступит полная свобода. В ответ я говорю: нет гарантий, что тогда свобода придет раньше. Даже если продолжать «душить» санкциями, власть не сразу упадет. Она будет еще больше влезать в долги и продлится это еще несколько лет. В конце концов, режим угодит в долговую яму, но ведь там окажемся и мы. Никто долгов так просто не прощает. Поэтому я рассматриваю санкции как опасную вещь для экономической независимости страны. Они еще больше усилят тенденцию движения в Россию.

Да, я недавно разговаривал с главой президентской администрации Владимиром Макеем. Наверняка, у меня и у власти разное стратегическое видение ситуации, путей дальнейшего развития страны. Но есть объективные сферы общих интересов. Например, спасение страны. Из Беларуси я никуда эмигрировать не собираюсь. И большинство тех, кто при власти, похоже, тоже.

Моральный аспект. Некоторые говорят, что такая политика не моральна, потому что власть авторитарная. Я же считаю, что нужно думать не только о нашей с ней борьбе, а прежде всего о людях. Белорусов почти десять миллионов. В чем их интересы? В том, чтобы наступил крах экономики, и любой ценой ушла эта власть? Ценой независимости и свободы? Ценой ухудшения жизни людей?

В условиях экономического кризиса у России появятся дополнительные способы влияния на политический процесс в Беларуси. Да, сегодня треть белорусов говорят, что твердо хотят в Евросоюз. Предпочтения остальных с помощью «вентиля» можно «колыхнуть» довольно легко. Дескать, если вы хотите интегрироваться с Россией, цены на газ будут маленькими, а, если желаете идти в Европу, то они вырастут в несколько раз. В таких условиях очень сложно будет заручиться поддержкой большинства.

Такой же аргумент наверняка использует будущий пророссийский кандидат в президенты. Каждому избирателю дадут понять, что льготные цены на газ возможны только в случае победы их креатуры. В результате, мы получим опасную для нашего будущего дилемму: дешевая колбаса или

достоинство и демократия. Мы знаем, что даже в цивилизованном мире не исключен выбор в пользу первого. У нас нет права рисковать судьбой Беларуси.

Поэтому лучше эволюция. Она очень мучительна и требует терпения. Никто не может дать гарантий успешности процесса. Но именно в ней я и вижу выход из тупика.

Абсолютная неправда (как пишут некоторые), что Европа стала на прагматичный курс, только потому, что хочет «поиметь здесь гешефт». Дескать, западный бизнес только и ждет, когда откроются двери. Но их бизнес самостоятелен в своих решениях. Если считал нужным, вкладывал свои деньги в Беларусь и до диалога. И никто в ЕС ему не мешал.

Согласитесь, для ЕС Беларусь не приоритет номер «один». Мы не такой уж «лакомый кусочек», как может показаться некоторым. Да, мы имеет преимущества в образованной, недорогой рабочей силе и трудолюбии людей. Но в сегодняшнем состоянии большинство наших предприятий с устаревшим оборудованием мало интересны до тех пор, пока не созданы исключительно привлекательные условия для инвестиций. ЕС не хочет иметь на своих границах страну с неустойчивой, непредсказуемой политической системой. Не желает экономических кризисов и беспорядочной трудовой иммиграции.

К счастью, для объединенной Европы моральные ценности имеют большое значение.

**А.Т.: С одной стороны – власть, со второй – Запад. Они о чем-то договариваются между собой. Получается, что белорусская оппозиция как бы выпадает из процесса?**

А.М.: И да, и нет.

Все шаги, которые делает Европа, все ее предложения, нам хорошо известны. Более того, что нужно предпринять для либерализации Беларуси формулировали именно мы. И не только я. Многое сделано ОДС. Если бы в переговорах участвовали мы, то было бы предложено тоже самое.

Откровенно говоря, право стать в переговорном процессе третьим партнером надо заслужить.

В последние годы белорусская оппозиция существенно ослабла, имидж ее значительно ухудшился. Конгресс, который прошел в мае прошлого года был воспринят очень плохо. И не потому, что там Милинкевичу не продолжили полномочия. Лидером можно было избрать кого-то другого, но быть он должен обязательно. Увы, вместо этого предпочли ротацию и очень многое потеряли. Всех смешит лидерство по очереди. Так не бывает.

Ротация была придумана для «внутреннего потребления», чтобы никто не вырывался вперед. Мы, повторюсь, потеряли очень много. И, прежде всего, внутри страны. За стол переговоров садятся равные партнеры. С польской «Солидарностью» власть вынуждена была считаться только поле того, как больше не считаться не могла. Это первая причина.

Далее. Да, мы не участвуем напрямую в переговорах, но с нами пока считаются. А для того, чтобы считались и в будущем, нужно прекратить все «разборки» между собой. Нам нужно не оценивать кого-то, а работать. Нести правду нашим людям.

Надо среди населения инициировать диалог о развитии страны.

Я это называю европеизацией белорусского общества. Как гражданского, так и всего остального. Для меня это, прежде всего, изменение мышления. Уход от большевистских стереотипов и широкая информированность о тех моральных принципах, которые объединили Европу.

Геополитический выбор делается именно сейчас. Или потеряем страну, или сохраним свою Независимость.

**А.Т.: В чем суть ваших главных упущений последнего времени?**

А. М.: В том, что пока окончательно не создано общенациональное широкое движение. Пробелорусское и проевропейское. Я верил и верю сейчас, что людей можно объединить только на общих моральных ценностях. Надеялся, что некоторые перестанут говорить о партийных идеологиях, собственных амбициях, и поймут, что «за спиной страна». В регионах нам удалось многое. Там люди лучше умеют работать коалиционно. Главный акцент нашей работы – поддержка активных небезразличных людей и помощь им в самоорганизации, в решении местных проблем.

Нам удалось создать довольно эффективную систему защиты репрессированных. Она позволяет разрушать парализующий страх в обществе.

К сожалению, оппозиция сегодня гораздо более разобщена, чем была до президентских выборов 2006 года. И та имитация единства, которая сейчас есть в Коалиции, на мой взгляд, очень большая наша проблема. Во время последней парламентской кампании я посетил 35 городов, поговорил с тысячами людей. Раньше мы им говорили – объединились, потому что против беззакония, страха и т.д. Одним словом, «дружим против режима». И люди воспринимали нормально. Сегодня это уже не проходит.

– Против, ну и что? Мы тоже! Но какую модель Беларуси предлагаете и чем вы лучше этой власти? Какое ваше видение будущего?

Они просят доказать, что наша власть обеспечит им более достойную жизнь.

Увы, ОДС в сегодняшнем варианте не может выработать внятную программу реформирования Беларуси. Там все нормальные и хорошие люди, но у каждого виденье ситуации и геополитические ориентиры разные. Одни больше за интеграцию с Москвой, другие – за Европу. Для одних важнее национальные ценности, других – либеральные, третьих – коммунистические.

Уверен, что ОДС надо сохранить. Это площадка для дискуссий, но в ней должны быть два блока. Левый и правоцентристский. Каждый должен иметь свою программу. И эти программы будут понятными людям, их не выхолостит поиск взаимных компромиссов. Сейчас там только лозунги

**Беседовал Александр ТОМКОВИЧ, www.nmnby.org**




# Усе пратэсты заканчваюцца судамі

**У Горадні аматараў прыроды аштрафавалі на тысячу баксаў. Насуперак лёгіцы і мэтазгоднасьці.**

Вынік вядомы: траіх “дробных хуліганаў”, якія пратэставалі супраць сьпілоўваньня нармальных здаровых дрэваў, пакаралі на агульную суму два мільёны сто тысяч рублёў – карацей, ажно на тысячу даляраў. Вось і задумаесься: а што, уласна кажучы, здарылася, чым небясьпечныя аматары прыроды цяперашняй уладзе?

Адбывалася ўсё наступным парадкам: на Тэлеграфным завулку ў гістарычнай частцы гораду кіраўніцтву каледжу камунальнай гаспадаркі заманулася прыбраць каля дзясятка дрэў: маўляў, растуць яны бліз будынку (дарэчы, які захаваўся з пачатку мінулага стагодзьдзя), лісьце ападае на дах, забівае вадасьцёкавыя трубы. Усё было зроблена паводле адпаведнага парадку: камісія дала дазвол на зьнішчэньне дрэў, каледж заключыў дамову зь “Зелянбудам”, прыехалі рабочыя з піламі.

А далей на месцы падзеі апынуўся Эдвард Дмухоўскі, стаў фатаграфаваць шэраг дрэваў, якіх больш ня будзе, каб засталіся хаця б здымкі. Уласна кажучы, гэта й было расцэнена судом як дробнае хуліганства. Праўда, каб узмацніць “віну”, міліцыянты цьвердзілі ў судзе, што ён адмовіўся пакінуць месца здарэньня, стаў “абдумаць дрэва”. Гучала гэта недарэчна.

Сам Дмухоўскі прызнаўся – міліцыянты спыталі: “хто ўдзельнічае – у дзяжурную машыну, хто не – адыдзіце ўбок”. Адысьці дазволілі прысутным журналістам, у Дмухоўскага спыталіся асабіста, і яму не дазволіў гонар пакінуць удвох Ігара Лапеху і Надзею Крапівіну, якія пратэставалі супраць сьпілоўваньня дрэваў. Як ён патлумачыў судзьдзі Натальлі Козел, зрабіў гэта “дзеля салідарнасьці”. Салідарнасьць Козел ацаніла сьціпла, “усяго” на пяць базавых адзінак, гэта 175 тысяч рублёў.

Ігару Лапеху “выпісалі” самы вялікі штраф – трыццаць мінімалак, Надзеі Крапівінай, якая на ўтрыманьні маці і ня мае заробку, – дваццаць пяць. Але іхняя віна была расцэнена як большая, бо адмовіліся сядаць у варанок, Лапеху міліцыянты цягнулі ў машыну па вуліцы. Здавалася б, ім павінна было стаць няёмка ад здымкаў, якія трапілі ў інтэрнэт: узброены аўтаматамі Калашнікава нарад гвалтам схапіў чалавека, які ўсяго толькі прасіў не пілаваць дрэвы! Але ж не, копіі здымкаў былі прыкладзены да справы, якую зь міліцыі перадалі ў суд у якасьці “доказаў віны” Лапехі.

Паспрабуем падсумаваць: трэба пілаваць дрэвы ў гістарычнай частцы Горадні ці не? Правільна гэта ці не, дабро гэта ці адназначнае зло? Варта сказаць, што вельмі доўга ніхто за дрэвамі не сачыў. У газэтах былі адно нараканьні, што ў савецкія часы насадзілі таполяў, ад пуху якіх немагчыма дыхаць, якія павялічваюць алергію у жыхароў. Але цяпер іх няма, у цэнтры стала здаравей, лягчэй дыхаць улетку. Праўда, стала меней зяляніны, бо пляжыць пачалі іншыя дрэвы, а апошнім летам масава захварэлі славутыя гарадзенскія каштаны, так што яны таксама ў небясьпецы быць сьпілаванымі.

Трэба заначыць, што ёсьць людзі, якія шкадуюць кожнае дрэва, а іншым на гэта ўвогуле напляваць. Абаронцы гістарычных кварталаў, напрыклад, супраць разбурэньня любой камяніцы, але жыхары старых дамоў, у якіх няма нармальнага туалета, настроены адваротна: хай улады прышлюць бульдозэр, а ім дадуць кватэры ў спальных раёнах.

Такім чынам, нерэальна абмяркоўваць лёс кожнага дрэва з грамадзкасьцю. Аднак праблема ў тым, што зь ёю ніхто нічога абмяркоўваць не зьбіраецца, гульня ідзе ў адную браму. Усе пратэсты сканчаюцца пратаколам і судом. Другі бок тым часам мае поўную свабоду: любы начальнік, калі яму захочацца, сьпілаваць дрэвы, зробіць гэта без праблем – з дазволам будзе ўсё ў поўным парадку.

Вось якраз гэтае няроўнае і несправядлівае, як лічаць абаронцы прыроды, становішча выклікае пратэст зь іхнага боку. Пратэст, які ня можа закончыцца пры цяперашняй уладзе посьпехам. Гэтая ўлада ня церпіць ніякіх пратэстаў.

**Алесь КАВАЛЁЎ,**
**www.bulletinonline.org**



*Опіўмны мак*

## СТОП наркотыкам!

**Падчас міжнароднай аперацыі “Канал-2008” у Беларусі выяўлена 214 нарказлачынстваў**

Падведзены вынікі міжнароднай комплекснай аператыўна-прафілактычнай аперацыі “Канал-2008” (першы этап праводзіўся з 15 па 22 верасня, другі — з 17 па 24 лістапада). У ёй бралі ўдзел праваахоўныя органы дзяржаў — членаў Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы, а таксама ўпаўнаважаныя прадстаўнікі каля 20 краін (ЗША, Італіі, Іспаніі, Кітая, Афганістана і інш.).

Як паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязей МУС Беларусі, асноўнай мэтай мерапрыемства з’яўлялася перакрыццё каналаў кантрабанды какаіну з Лацінскай Амерыкі, сінтэтычных наркотыкаў з Усходняй Еўропы, афганскіх апіятаў на тэрыторыю краін Еўразійскага рэгіёна, а таксама спыненне незаконнага паступлення прэкурсораў у краіны Цэнтральнай Азіі і Афганістан. Па задуме арганізатараў, правядзенне спецаперацыі садзейнічае развіццю эфектыўнага супрацоўніцтва з кампетэнтнымі органамі краін, тэрыторыя якіх выкарыстоўваецца транснацыянальным наркабізнесам для вытворчасці або транзіту наркотыкаў.

**Паводле БелаПАН**

# Адзін год абмежаваньня свабоды Беразенку

**Ад 27 кастрычніка Аляксандра Беразенку трымалі пад вартай, абвінавацiўшы ў арганізацыі групавых дзеяньняў, якія нібыта прывялі да масавых беспарадкаў падчас студзеньскіх акцый прадпрымальнікаў. Апошняга фігуранта ў “справе 14-ці“ вызвалілі ў судовай залі.**

Сваякі, паплечнікі, лідэры палітычных партый і рухаў, прадстаўнікі амбасады ЗША і АБСЭ павіншавалі Аляксандра Баразенку з вызваленьнем, як толькі зь яго зьнялі кайданкі. Нягледзячы на тое, што Аляксандра пакаралі абмежаваньнем волі, а не апраўдалі, прысуд сустрэлі воплескамі. Аляксандру Баразенку ўручылі кветкі і ўлёткі на памяць, зь якімі амаль два месяцы моладзевыя актывісты стаялі ў пікетах, патрабуючы вызваленьня апошняга палітвязьня.

Старэйшы памочнік пракурора Цэнтральнага раёну сп. Ціхавец прасіў суд пакараць Аляксандра абмежаваньнем волі на паўтара году. Іншыя фігуранты “справы 14-ці” былі пакараныя штрафамі і абмежаваньнем волі да двух гадоў.

Адвакат Баразенкі Павал Сапелка удакладніў, што рэальна Аляксандар будзе адбываць пакараньне 9 месяцаў, таму што праведзены ў СІЗА дзень лічыцца за два.

Аляксандр Баразенка паведаміў, што будзе абскарджваць прысуд. Ён мусіць адбываць пакараньне ў Пінску, па месцы прапіскі. Калі ён зьедзе ў Польшчу, дзе ён вучыцца ва Ўроцлаўскім унівэрсытэце па праграме Кастуся Каліноўскага, яго могуць пазбавіць волі з адбыцьцём пакараньня ў папраўчай калёніі.

**Паводле**
**Радыё Свабода**



kamunikat.org

# Што Еўразвяз дасць жыхарам Мастоўшчыны?

**Актывісты Мастоўскага Руху “За Свабоду” і Маладога Фронту распаўсюдзілі 400 асобнікаў брашур “Што Еўрапейскі Саюз можа даць Беларусі”.**

Актывісты Руху і МФ распаўсюджвалі інфармацыйныя брашуры ў Мастах, вёсках Лунна, Дубна, Мікелеўшчына, Мастах Правых і Мастах Левых.

Па словах рэгіянальнага каардынатара Руху “За Свабоду” у Гарадзенскай вобласьці Алеся Зарэмбюка, акцыя была арганізавана з мэтай пашырэньня інфармацыі пра 12 прапановаў Еўрапейскага Звязу беларускаму народу і яе ўраду, а таксама з мэтай пашырэння ідэі еўрапейскай інтэграцыі і прапаганды еўрапейскага ўзроўню жыцця, які мы зможам дасягнуць пры ўступленні нашай краіны ў Еўрапейскі Звяз.




**Прэс-служба Руху «За Свабоду»**




## За еўрапейскую Мастоўшчыну

**Актывісты Руху "За Свабоду" і прадстаўнікі грамадскіх аргаганізацый і ініцыятываў распачалі грамадска-інфармацыйную кампанію "За Еўрапейскую Мастоўшчыну"**

Удзельнікі кампаніі распаўсюдзілі улёткі і расклеілі плакаты з інфармацыяй і кантактамі, праз якія можна далучыцца да ініцыятывы. Каардынуе кампанію актывіст Руху, дэпутат Мастоўскага райсавета 24 склікання Аляксандр Зарэмбюк.

Актывісты Руху "За Свабоду" плануюць інфармаваць жыхароў рэгіёну пра перавагі інтэграцыі Беларусі ў Еўрапейскі Саюз і папулярызаваць еўрапейскія каштоўнасці на Мастоўшчыне.

Акрамя гэтага, грамадскія актывісты намераны займацца вырашэннем шэрагу сацыяльных і камунальных праблемаў раёна, кансультаваць жыхароў Мастоўшчыны па шырокім спектры грамадска-значных пытанняў, займацца развіццём мясцовага самакіравання, рэгіянальнага развіцця і дапамагаць жыхарам Мастоўскага раёна ў абароне іх правоў і інтарэсаў.

**Прэс – служба Руху "За Свабоду"**

# Мілінкевіч у Гродне

**Запрашаем на сустрэчу з лідэрам Руху "За Свабоду"і лаўрэатам прэміі Еўрапарламента "За свабоду думкі" Аляксандрам Мілінкевічам. Сустрэча адбудзецца ў Гродне 13 снежня, пачатак а 12-й гадзіне.**

Аляксандр Мілінкевіч прадставіць сваё бачанне праблемы пабудовы АЭС на Гарадзеншчыне, новай палітычнай сітуацыі ў Беларусі, перспектываў бязвізавага руху для жыхароў 50 км прымежнай зоны, энергетычнай бяспекі краіны, развіцця прыватнага бізнесу, інвестыцый, экалогіі і захавання культурнай і гістарычнай спадчыны Беларусі.

У сустрэчы возьмуць таксама ўдзел лідэры дэмакратычнага руху з усіх рэгіёнаў Гарадзеншчыны.

Сустрэча з Аляксандрам Мілінкевічам пройдзе ў адкрытым, свабодным фармаце.

Тэмы і пытанні, на якія Вы хацелі б пачуць адказы Аляксандра Мілінкевіча, ужо сёння можна дасылаць на адрас zasvabodu.hrodna@gmail.com

Пачатак: 13 снежня (субота), а 12-й гадзіне, па адрасе: Гродна, вул. Будзёнага 48а-44 (памяшканне Таварыства Беларускай Школы).

# Першы год працы «Белсату» быў удалым

**Першы год працы спадарожнікавага тэлеканала «Белсат» быў удалым, заявіла 10 сьнежня ў інтэрв'ю БелаПАН яго дырэктар Агнешка Рамашэўская.**



*Агнешка Рамашэўска*

«Мінулы год ацэньваю вельмі добра. Мы зрабілі тое, што хацелі, выканалі пастаўленыя перад сабою задачы», — сказала А.Рамашэўска.

Паводле яе слоў, цяпер на тэлеканале ў Польшчы працуюць прыкладна 70 супрацоўнікаў, у Беларусі — каля 120.

«Гэта і журналісты, і рэжысёры, і мантажоры, і аператары.

У нас у Беларусі некалькі карэспандэнцкіх пунктаў»

«У нас шмат добрых таленавітых супрацоўнікаў. Калі падумаць, што большасць нашых журналістаў не з'яўляюцца тэлевізіёншчыкамі і яшчэ паўтара гады таму не працавалі на тэлебачанні, а сёння яны ўжо робяць даволі прафесійныя праграмы, то гэта цуд», — сказала дырэктар канала.

Згодна з праведзенымі даследаваннямі, зазначыла дырэктар тэлеканала,

«Белсат» глядзяць прыкладна 200 тыс. беларусаў. «За тры месяцы вяшчання з «Сірыуса» — гэта шмат.

Я гэтымі вынікамі вельмі задаволена», — сказала А.Рамашэўска.

Паводле яе слоў, час вяшчання тэлеканала складае шэсць гадзін і пакуль павялічваць яго не плануецца.

«Гэта залежыць ад фінансавых магчымасцей. Але з часам, магчыма, колькасць гадзін будзе павялічана», — паведаміла А.Рамашэўска.

Пагадненне аб стварэнні спадарожнікавага тэлеканала «TV Беларусь» было падпісана 23 красавіка 2007 года паміж Польскім грамадскім тэлебачаннем (TVP) і Міністэрствам замежных спраў Польшчы. 18 ліпеня TVP зацвердзіла ў сваёй структуры новы спадарожнікавы тэлеканал, які атрымаў назву «Белсат». 10 снежня 2007 года з выпуску навінаў пачалося тэставае вяшчанне «Белсата». Тэлеканал фінансуецца з рэзервовага бюджэту польскага МЗС.

**БелаПАН**

**РЭГІЁН**
Інфармацыйнае выданне
**№ 8 11 сьнежня 2008 г.**
Надрукавана ў друкарні
ААТ "Смоленская печать"
г. Смоленск
ул. Ломоносова д.3
Выходзіць адзін раз у месяц
Распаўсюджваецца бясплатна
**Адказны рэдактар:**
**Зьміцер Васілеўскі**